# БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

АДРЭС: Рэдакцыі Ново-Серпухуская 29. Адміністрацыі Захароуская «Юбілейны Дом».

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рубл.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран 1 руб. на апошняй—50 к п

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 87. Менск. Чацьвер 11 ліпня 1918 г. Год I


## АБВЕСТКІ.

На аснові артыкулаў 22, 23, 24, 25 і 112 Становішча 29 верэсня 1917 г. аб меськіх прыбытках, выдатках сьметах і папрахупках Менская Меськая Управа апавешчае, каб усе ведалі, што ацэнка нірухомых меняў у месьці Менску дзеля ўзыскання меськаго ацэначнаго збору у 1918 годзе паводлуг мінулаго году нізмяніласа за выключэннем меняў перабудованых і зноў зарэгістрованных, а так сама належачых казённым, царкоуным і манастырскім установам.

Ацэначны збор ад нірухомых менняў у карысьць места Менску на 1918 год вызначэны у размеры 20% чыстай прыбытнасьці ад іх і павінен быць ўнесены у меськую кассу ні пазней 15 жніўня гэтаго году па новаму стылю пры разасланых меськай управай акладных лістах.

Зборы, пі ўнесеныя да гэтаго сроку, лічуцца нідаімкай і на іх ад 1-го верэсня г.г. будзе далічацца пэня у размеры 1 кап. ад кожнаго рубля нідаімкі у месяц, прычым сумма нідаімкі у 50 і болей капеяк лічыцца за поўны рубель і ні кончэны месяц за поуны. Скаргі на ацэнкі павінны быць заяулены Управе ні пазней 1-го жніуня гэтаго году. Ад 15-го верэсня г.г. ніуплачэная нідаімка збору 1918 году будзе узысківацца праз міліцыю прымусовым спосабам.

8 ліпня 1918 г.

Меські Войт **С. Хржонстоускі.**
За Сэкрэтара **Позняк.**
Дзелавод **Р. Бортневіч.**

**№ 72/7926.**

---

**Будоуніцкі аддзел Менскай Меськай Управы,** з мэт падмогі пацярпеушаму ад вайны насяленню, распрадае уласьнікам майстэрняу, хвабрык, заводау, каапэратываў і іншым патрэбіцелям для уласных патрэб **розны жалезны і будоуніцкі матэрыял.**

На рэч пакупкі павінна быць падана у Будоуніцкі Аддзел Управы пісьменая заява с паказаннем прапанованай цаны за купляемае і дзеля якой патрэбнасьці гэта самае куляецца. Прыем заявау што дня ад 12 да 3 гадзіны у дзень.

Агляд рэчэй на прадажу на складзе пры Управе на Ораускай вуліцы і на складзе пры парку конна-жалезнай дарогі.

Член Управы
Інжэнэр **В. Цывінскі.**
Загадч. скл. **С. А. Усьціновіч.**

**№ 1600/7880.**

---

Усе р зьнікі павінны у мейсцох прадажы павесіць вывескі з нямецкімі і расійскім напіс. Кожны р зьнік павінен заявіць № сваэй крамы купляючы мясо у гарадзкой бойні.

Выв ескі тр ебг адтрымаць да серады 10 ліпня на бойні
Менск, 9 ліпня 1918.

Нямецкі Градоначальнік.

---

Усе рстараны і сталоукі, якія атрымліваюць прадукты ад харчавога аддзелу Градачальства, павінны заяуляць запатрэбаванні па аўторкам ад 10—12 ч. у дзень, у другія ні запатрэбаванні прыймацца ні будуць.

З запатр баваннямі на цукер трба, як і дагтуль, ьвертацца у харчавы камітет, а ні у граданачальство.
Менск, 9 ліпня 1918 г.

Нямецкі Градоначальнік

## *Менск 11/VII.*

### Земля блізка.

Рада вялікай большасьцю прыняла дэкларацыю габінэта Скірмунта. Пасля аратары фракцый высказывалі свае пагляды. Вельмі цікава было слухаць мову лідэра самаго леваго крыла Рады — беларускіх эсэроў. Праграмма іх звычайна рэвалюцыйная, па першаму разраду. Але, трэба прызнацца, і гэта «страшная» парція для рэакцыянэрау, ні зыйшла з дзержаунаго беларускаго пачуцця. Гэта ні усерасійская левая парція, катэрая ні чуе ніякіх граніц і абавязкау да Усерасіі, яна—інтэрнацыянальна. Маленькая мястэчкова-вясковая Беларуская Дзержава маець здаровую порцыю мужыцкаго беларускаго скептыцызма і гонару. Нашы самыя левыя беларусы больш беларусы і перш беларусы, а потым ужо парційцы. Нідаўна адзін з нашых самых левых выступау у Маскве на мітынгу, там яго, паслухаушы, хацелі арыштаваць як контр-рэвалюцыянэра.

На сходзе Рады дэкларацыя падыйшла да зямлі бліжэй, як усе рэвалюцыоныя праграмы. Скупка зямлі добравольная і часам прымусовая ад вялікіх землеуласьнікау Народным парцэляцыенным (хутарскім) банкам для прыбаукі зямлі беззямельным і малаземельным земляробам. Забарона спекуляцыі зямлей. Гэта можна легка увясьці у жыцце. Рээвакуіраваць з Расіі «Крестьянскій банк» і перэрабіць яго для гэтай мэты. Калі адзін аратар трэбавау, каб земля бралася і давалася дарам, нейкі жартаунік кінуу жарт: «У Маскве дарам даюць тры аршыны»!

Усе прыпомвілі да якога разбурэння і гібелі давела «соцыялізацыя» Вялікаросію... Старэйшая наша партыя, «Беларуская соцыялістычная грамада» прыняла дэкларацыю, як мінімум сягоднейшняго дня. Усякі нармальны чалавек пачувае, што лепш сініца у руках, як жураўель у небі.

Гэта есьць шчасьце Беларусі—мудрасьць яе Рады. Учора зямля падсунулася к беларускаму цярпліваму і традыцыйна-культурнаму земляробу саусім блізка с туманнай далі. Земля, данная народу большэвікамі у Вялікарасіі, будзе, шаленай рэакцыей, каторая там навісла чорнай хмарай, вырвапа з рук на доугія годы; большэвіцкая «соцыялізацыя» давяла ужо Вялікарасію да «торбы». Украінская соцыялістычная Рада аддала усю зямлю усяму украінскаму народу. Рэакцыя скінула «соцыялізатарау», і там ідзець разруха з адбіраннем зямлі і «усьмірэннямі». Бедны цемны народ аглушаны; земля паехала ізноу у туманную даль.

Мы яшчэ раз гаворым, што беларусы скарэй усіх народау дастануць зямлю. У нас ніколі ні было ні еурэйскіх пагромау, ні аграрных эксцэсау. Большэвіцкая расійская армія грабіла двары але натта малы працэнт беларусоу ім памагау. Наадварот, селяне нашы шмат чаго абаранілі ад разрухі. Беларус заслужыу, каб яму прыбавіць роднай зямлі. Трэба нашаго земляроба вывясьці з голаду, бо ен—фундамэнт багацця Дзержавы.

**А. У.**

---

## Агульныя весткі.

### Забіуство гр. Мірбаха.

МАСКВА. «Вольф». Каб дабіцца прыёму у графа Мірбаха, абодвы забойцы парупіліся аб пасьвядчэнні, што яны—члены камісіі дзеля змагання с контр-рэволюцыяй і заявілі, што маюць загад ад вэнгэрскаго ахвіцэра Мірбаха, каторы нават ні свой нямецкаму паслу. Пасьля кароткай гутаркі с паслом, забойцы пачалі стрэляць з рэвальвэраў і кінуўшы ручныя гранаты выскачылі праз вакно. На вуліцы на іх чакаў гатовы самаход, на каторым забойцы і уцяклі. Чычэрын, Карахан, Ленін і Сверулоў заявілі членам нямецкаго пасольства, што ліхадзейство ні гэтулькі проці Нямеччыны, колькі проці большэвікоў. Дом соцыялістаў рэволюцыянэраў, у каторым цяпер ніхватае іх кіраўнікоў—Камкова, Корэліна і Сьпірыдонавай, акружаны большэвіцкім войскам. Да левых соц.-рэв. прылучылася правая часьць, Савінков і агенты саюзнікаў. Савінкоў падтрымоўвае зносіны с чэхо-словакамі. Пры Керэнскім ён быў ваенным міністрам. За пакушэнне на Мірбаха павінен адказываць Савінков. Нямецкі урад выказаў расійскаму ураду сваё цьвёрдае перакананне, што злочынцы і падбіўшыя іх на гэто будуць узяты і пакараны. Адзін з членаў большэвіцкаго ураду пасяліўся у доме нямецкаго пасольства, каб паказаць што большэвікі прынялі яго пад сваю апеку.

БЭРЛІН. Абодва забойцы графа Мірбаха укрыліся у доме, занятым соцыялістамі-рэвалюцыянэрамі, прыхільнікамі саюзьнікаў, каторы абараняўся кулямётамі. Есьць думка, што забіўство графа Мірбаха павінно было быць сыгналам паўстання прыхільных да саюзьнікаў соц.-рэв. У Маскве ідуць бітвы, канец каторых ні вядомы.

БУКАРЭШТ. Румынскі урад маніцца аддаць румынскі скарб, які знайходзіцца у Маскве у Крэмлю пад апеку нямецкаму пасольству.

ВУКАРЭШТ. У часе парады у Сэнаце аб ратыфікацыі міру, сэнатор Глерота вінаваціў у спаткаўшым Румынію нішчасьці і караля Фэрдынанда, каторы ні павінен быў даваць волі Братіану. Калі-б кароль быў больш энэргічны, дык вайны ні было-б. Ніхай-жа тое, што здарылося, будзе навукай на будучыну.

Маргіломан атказаў, што адпаведнасьць за вайну ляжыць на ўсёй лібэральнай і часьці консэрватыўнай партыі. Цэнтральныя дзержавы ніколі ні вымагалі зьмены дынастыі.

ВЕНА. Газэты друкуюць

вестк і с Парыжу і Рыму аб нібыто зайшоўшых пераменах у вышэйшым аўстрыйскім камандаваньні. Весткі гэтыя,— мэта каторых зусім яспая,— выдуманы ад пачатку да канца.

ВАШЫНГТОН. Марскі дэпартамэнт апавесьціў што ваенны транспорт «Ковенктор», 16.339 тонн, затоплены у панядзелак ноччу, пры звароце дамоў.

БЭРЛІН. Згодна пакрэсованых цэнзурай гэнуэзскіх газэтаў відаць, што у Гэнці высадзілося амэрыканскае войско.

ЖЭНЭВА. Французкая урадовая газэта апублікаваза франц,-грэцкі трактат, на моцы якога усе пражываючыя у Францыі грэкі будуць прызваны у Французскую армію.

БЭБН. ««Teꞥps» павядамляюць з Ліссабону, што генэрал Гарсія Розага назначаны глаўнакамандуючым партугальскіх войск на заходнім фронце. Перад заняццем пасады генэрал паедзе у Англію для парады у тэхнічных пытаннях.

КОПЭНГАГА. Новая французкая палітычная партыя пад назвай «патрыотычнай партыі соцыялістаў» належыць 40 паслоў парлямэнту. Органом партыі ёсьць новая газэта «Franse libie» каторай кіруе, паобно, Альбер Тома. Газэта праводзіць ідэю, што інтэрэсы французскаго работніцтва зьвязаны с пабедным канцом вайны і што паражэнне Нямеччыны адсунуло б нібэзпеку угняцення французскаго пролетарыяту. У другім артыкуле газэта выступляе проціў большэвікоў у Расіі.

БЭРЛІН. У Баварыі пачалося жніво жыта. Першыя вагоны сяголятняго збожжа ужо пасланы у млыны.

БЭРН. 6 г,м. «Вольф». На работніцкай конфэрэнцыі у Лёндане 25 прошл. мес. член парлямэнту Джэмс О'Грандзі Запрапанаваў прыняць рэзолюцыю аб увядзенні гомруля для Ірляндзіі зараз-жа, пры чым сказаў:

«У імя Бога ні дапусьціце да такой ганьбы, каб Англія была змушана сваімі ворагамі і непрыяцелям да прыняцця гэтых прынцыпіяльных асноў справедлівасьці на мірнай конфэрэнцыі! Калі урад запатрэбаваў ад парлямэнту прыняцця закону аб вайскавой службе у Ірляндзіі з запэўненнем за гэто аб гомрулю, то ён адзначаў тагды з націскам, што самапраўленне Ірляндзіі ёсьць фундамант ураду. Я запытаўся прэзэса міністраў чы гэто так папраўдзі і прэм'ер надцьведзіў, але усё ,шчэ трымаецца на даўшым сваім становішчу. Я прашу дзержаўных мужоў, прэдстаўнікоў заатлантыцкіх калоніяў, якія прыймаюць участье у цяперашней агульна-дзержаўнай конфэрэнцыі каб яны настаівалі на аддапні ім агульна-дзержаўнай конфэрэнцыяй урэгуліровання гэтаго пытання».

**Фінансавыя затрудненія Кітаю.**

Як піша карэспондэнт «Таймс'у» з Пэкіну, кітайскі урад у сваім часе пазычыў ад японскаго сындыкату 2 мільёны ангольскіх фунтаў пад заставу свасй тэлеграфнай сыстэмы, якія грошы разыйшліся дзеля ўнутранай вайны. У астатніх месяцах Японія зноў пазычыла Кітаю 2 мільёны ангельск. фунтаў. Цяпер Кітайскі урад маніцца зрабіць новую пазычку пад заставу сваёй тытунёвай манаполіі, што на доўга цяжка адзавецца на фінансах Кітаю.

Агромныя грашовыя патрэбы Кітаю выклікаюцца ні перастаючай дамовай вайной паміж поўначу і поўднем. Ангельскі корэспондэнт зьвертае увагу дзержаў коаліцыі на гэтае заблутанне. Унутрана-кітайскае становішчо і заклікае дыпламатію гэтых панстваў ні дапусьціць поўнаго упадку Кітаю увольніўшы яго ад ваеннаго зьвязку.

Японія падсоўвае Кітаю грошы падстаўляючы спосаб для унутранай барацьбы. Відаць што гэта сіла, праз якую Кітай пападае у яе рукі.

## МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

**Зруйнаваныя прыходы.** У кансысторыю прыйшлі афіцыяльныя весткі ад прэдстаунікоу духавенства аб цэлай сэрыі зруйнаваных вайною парахвіяу новагрудзкаго павету. Зноу наладзіць у гэтых прыходах нармальнае царкоунае жыцце німа ніякай мажлівасьці дзеля браку у кансысторыі якіх бы то ні было будоуніцкіх крэдытау.

**У меськай управе** былі расформованы і зьменьшаны усе аддзелы, апрача бухгалтэрыі і ацэначна-налагавога.

У апошнім шмат служачых будзе нават павялічаны.

**Вучыцельскія курсы** пры пачтовай гімназіі, дзе дырэктарам вядомы пэдагог Л. Н. Цьветкоу, адчыняюцца гэтымі днямі. Курсы двухмесячныя, плата 120 руб. Дзеля паступлення на курсы трэба мець пасьвядчэння аб аканчанні вышэйшай пачатковай школы.

**Інфэкцыйныя занядужанні у месьці**, па вестках мэдыцынскаго аддзелу магістрата, за апошнія дні здараюцца вельмі рэдка.

Тыфусу і шкарлятыны зусім німа.

**Сямейны вечар скокау** Беларускай вучнеускай Грамады у «Беларускай Хаце» адбудзецца сягоння, 11 ліпня, а 8 гадзіне вечара.

**Канцэрт і спэктакль** беларускаго хору Цераускаго адбудзецца у «Беларускай Хаце» у суботу, 13 ліпня.

**Выстаука кніжнаго штукарства** учора, 10 ліпня зачынілася.

**Мясо** сягоння 11 і заутра, 12-го ліпня, будзе выдано па запасному бону № 8.

**Праверка бонавых кніжак** ва усіх 5-ці бонавых бюро закончыцца сегоння, 11-го ліпня. 12 ліпня будуць рэгістравацца толькі ніусьпеушыя.

**С прычыны сьвята** апостолау Петра і Паула заутра, 12-го ліпня, у меськай і земскай управах (для праваслауных) і у усіх казенных установах працаваць ні будуць.

## Весткі с краю.

**Радашковічы**, 23 чэрвеня, «Беларускай хатай» была арганізована вечарынка. Гралі: «Бутрыма Няміру», (пьеса Ф. Алехновіча) і «Моднаго Шляхцюка».

Першы раз у м. Радашковічах была так багатая сцэна, як ігрой артыстаў, так і дэкарацыямі. Ігра артыстаў зрабіла уражэнне ні толькі на народ, але і на усю мейсцовую інтэлігэнцыю.

Прайшло ужо с таго вечара 2 тыдні, але публіка часта успамінаець цікавыя мейсцы з беларускай сцэны.

Цяпер у Радашковічах шыкуюцца паставіць »Базылішк» казка у 3 акт. Ф. Алехновіча.

**Тутэйшы.**

**Горадня.** Тутака прымаюць царскія рублі толькі па курсу 1 рубель=1 марка.

А 1 кастрычніка 1917 г. да 1 Сакавіка 1918 г. было 141 прыпадак урадзін і 340 —сьмерці.

**Ліда.** Ад 1 кастрычніка 1917 г. да 1 сакавіка 1918 г. радзілося 47 дзяцей, а памёрлі 124 асобы.

**Станіслявова** пад Горадняй. Тутэйшыя вялікія цагельні з Гофманскімі печамі пасьля 3-гадовай бязчыннасьці пачалі ізноў працаваць, пад кіраўніцтвам Об. Ост. Яны будуць даваць да 15 мільёнаў штук цэглы.

**Вільня.** Беларускі Камітэт за чэрвень месяц выдаў бедным 2556 дармовых абедаў, у тым ліку праз Беларускую страўню № 31 1912 абедаў і бонамі на іншыя страўні 644.

Абеды выдаваліся бедным дзецям і ніздольным да працы ці хворым сталым.

**Беластон.** Тут зноў пачалася пошэсьць крадзежы раменных пасаў. У мінулы тыдні украдзены 4. Па загаду уласьцей, шаўцоў, якія купляюць паясы цалкам, або часьцямі аддавацімуць пад суд, як супольнікаў зладзеяў.

«Гомап» № 53. 9/VII.

## Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 9 ліпня 1918 року.

### Захадні тэатр вайны.

**Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.**

Паўднёвай канала Ля—Бассэ былі разбіты ні адзін раз пачатыя варожыя атакі, па паўночным беразі Соммы былі адбіты яго сільныя націскі. Артылерыйскі бой аставауся на гэтых вучастках ажыулёным і час ад часу узмацовываўся у вечары па абедзьвум старанам Соммы.

**Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.**

Захадней Антэйль (паўднёва-усходней Нуайка) сягоння з рання пасьля сільнаго агня развіліся варожыя баі.

Каля лесу Віллер—Коттэрэ атакі французаў пацярпелі ніудачу.

Учора зьбіта 18 варожых самалётау.

Лейтэнант Біллік меў сваю 23 і 24 і летэнант Фрыдрых с ваю 21-ю перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **Людэндорф.**

## АБВЕСТКА.

Заяўленыя уласьнікамі рагаты скот, сьвіньні і г. і будуць праверапы Нямецкай Паліцыяй дзеля спраўджэння таго, што жывёлы сапраўды знайходзяцца у уластніка. Кожны уластнік нясець адказ за тое што жывёла знайходзіцца у яго.

**Нямецкі Граданачальнік.**

Менск, у Ліпню 1918 г.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**



Друкарня Я. А. Грынблят в